*– І апошняе. Што прыносіць найбольшае задавальненне ў рабоце?*

– У нашай прафесіі нічога нельга рабіць «з халодным носам». Я чалавек дастаткова эмацыйны і адкрыты і люблю, каб такая ж атмасфера была ў студыі. Каб разам з гасцямі мы змаглі падарыць эфірнае свята нашым слухачам. Свята глыбокай думкі, жывой напоўненай гутаркі, любові да беларускага слова. Каб ўсё гэта засталося з імі і пасля выключанага мікрафона.

## «ЗАДАЧА КАНАЛА “КУЛЬТУРА”» – ПРАДСТАЎЛЯЦЬ І АДКРЫВАЦЬ САПРАЎДНЫЯ СКАРБЫ»: ЯЎГЕН ТАЛКАЧОЎ

**Т. У. Малмыга,**
**К. Барысюк**, студэнтка 1 курса
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

*– Яўген Віктааравіч, вы працуеце музычным рэдактарам і маеце пэўнае дачыненне да фарміравання музычнай палітыкі канала «Культура». Як бы вы яе ахарактарызавалі?*

– Рознажанравай і разнастайнай для слухачоў усіх узростаў. У нас прадстаўлены ўсе музычныя жанры.

*– Над якімі праектамі працуеце асабіста вы? І як арганізаваны ваш творчы працэс?*

– Умоўна падзялю свае праграмы на тэкставыя – «Мелодыі тэатра і кіно», «Наша музыка», «Класіка раніцай», «Час на джаз», «Музычны калейдаскоп», «Музычны вечар» і праграмы, у якіх выкарыстаны інтэрвью – «Натхнёныя музыкай» і «Беларуская этнафонія» (па матэрыялах фальклорных экспедыцый). Адпаведна тэматыцы праграмы абіраю музыку і пішу тэкст, каб праілюстраваць твор, штосьці пра яго распавесці альбо пра аўтара і выканаўцаў. Праграмы, у якіх выкарыстоўваю інтэрв’ю, ствараю ў залежнасці ад цікавасцей і магчымасцей гасцей (госця). Звычайна і пад тэму таго ці іншага выпуску запрашаю госця, альбо тэму выпуску вызначае госць. Часта гэта размовы пра поспехі гасцей, іх творчыя ўдачы, музыку, якую яны выконваюць, актуальныя падзеі з іх жыцця. Падрыхтоўка да такіх праграм пачынаецца з вызначэння тэмы, і суразмоўцы, збор

інфармацыі, вызначэнне тэм і пытанняў да інтэрв'ю. Пасля запісу інтэрв'ю – яго мантаж, стварэнне аўтарскага тэксту і злучэнне фрагментаў матэрыялу ў адно цэлае.

*– Канал «Культура» аддае перавагу класіцы. Не лічыце, што гэтым некалькі аддаляеце моладзь?*

– Звышзадача канала «Культура» – папулярызацыя лепшых узораў айчыннага мастацтва і сусветнай спадчыны. Класіка таму і прызнаецца класікай, бо каштоўнасць гэтых твораў не губляецца стагоддзямі, падабаецца слухачам ўсіх узростаў. І кожны зварот да гэтых шэдэўраў дазваляе адкрыць для сябе нешта новае, натхняе на высокае і вечнае… Густы моладзі вельмі дынамічна змяняюцца. І яна як ніхто іншы цікавіцца нечым новым, папулярным, модным. І канал «Культура», зразумела, павінен папулярызаваць самае лепшае, дасканалае з новых узораў мастацтва. Тое, што можна лічыць мастацтвам зараз, чые каштоўнасці бяспрэчныя, што вабіць усіх. Задача канала «Культура» бачыцца не шакаваць, а забаўляючы навучаць, прадстаўляць і адкрываць, у тым ліку і для моладзі, сапраўдныя скарбы. Не падладжвацца пад нізкасортныя падробкі, модныя рытмы і матывы, а весці да высокіх мастацкіх узораў і выхоўваць такім чынам густы.

*– Ці ўлічваюцца схільнасці слухачоў пры фарміраванні музычных складнікаў канала?*

– Зразумела, калі супрацоўнікі канала ведаюць пра гэтыя прыхільнасці. Некалькі сезонаў таму я рабіў праграму «Любімая класіка» па заяўках слухачоў. На працягу доўгіх гадоў праграмы па заяўках слухачоў рыхтуе музычны рэдактар Таццяна Песнякевіч.

*– Зараз усе радыёстанцыі актыўна выкарыстоўваюць сацыяльныя сеткі. А як уплываюць сацыяльныя сеткі і сучасныя плыні ў музычнай індустрыі на музычную палітыку канала «Культура»?*

– Зразумела, канал «Культура» таксама выкарыстоўвае сацыяльныя сеткі для анонсаў сваіх праграм і сувязі са слухачамі. А ўплыў «сучасных плыняў» у музычнай індустрыі ў асноўным адлюстроўваецца ў праекце «ДНК».

*– А як у вас асабіста складваюцца адносіны з сацыяльнымі сеткамі?*

– Найперш дапамагае ў працы «Facebook» для знаёмства з апошнімі дасягненнямі нашых творцаў, для запрашэння суразмоўцаў у праграмы.

*– Вы – кампазітар. А ваша музыка гучыць на канале?*

– Я вучыўся як кампазітар, але не магу сябе лічыць ім.

*– З якімі кампазітарамі і музыкантамі супрацоўнічае канал «Культура»?*

– З кампазітарам Аляксандрам Літвіноўскім, які працуе на канале і займаўся музычным афармленнем праграм.

*– Якія музычныя праекты «Культуры», на ваш погляд, самыя знакавыя і заслужылі асаблівую любоў радыёслухачоў?*

– Складана кагосьці вылучаць, бо ўсе праграмы канала цікавыя і адметныя. Часам хочацца паслухаць рэтра-музыку, часам джаз альбо размову з госцем.

*– Вашы пажаданні у год юбілею канала калектыву і сабе.*

– Жадаю ўсім натхнёнай працы і асалоды ад зробленага!

## «КАНАЛ “КУЛЬТУРА” – РАБОТА ПА ДУШЫ»: СВЯТЛАНА КОЛМАК

**Т. У. Малмыга**
**Г. Г. Чарняўская**, студэнтка 1 курса
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

*– Святлана Мікалаеўна, як вы прыйшлі на канал «Культура»?*

– Маё супрацоўніцтва з Беларускім радыё пачалося ў 1997 годзе, калі студэнткай факультэта журналістыкі БДУ, я прыйшла на вытворчую практыку ў рэдакцыю 2-ой праграмы Беларускага радыё – «Радыё-2». З 2002-га – я ў штаце канала «Культура».

Добра памятаю, як Кацярына Іванаўна Агеева, першы дырэктар «Культуры», стварала канал з чыстага ліста. Сапраўды быў цікавы час, але і складаны. Кацярына Іванаўна звярталася да кожнага супрацоўніка, з кім жадала працягнуць працу, і разам шукалі магчымасці для сумеснай творчай рэалізацыі. Так было і са мной. Яна прапанавала займацца інфармацыйным вяшчаннем. У выніку, у нас склалася, як мне падаецца, самая лепшая інфармацыйная служба, якую ўзначаліла ў той час Вольга Гальпяровіч.

*– Ці памятаеце вы свой першы выхад у эфір на канале «Культура»?*

– Свой першы эфір на канале «Культура» я памятаю добра. Гэта быў, мабыць, трэці дзень вяшчання канала. Мы з калегамі сабраліся